**Important Bird Area:** Vieluta






© С. Левый

**Code:** BY043

**Central coordinates:** 52° 30' N 26° 41' E

**Location:** Brestskaya voblast: Gantsevichi region, Lunyanets region

**Area:** 51850 ha

**IBA Criteria:** A1

**National conservation status:** частка тэрыторыі ландшафтны заказнік рэспубліканскага значэння «Борскі»

**International conservation status:** ТВП міжнароднай значнасці, утворана ў 2005 годзе

## Site description:

ТВП Велута знаходзіца ў паўночна-усходняй часцы Брэсцкай вобласці ў Лунінецкім і Ганцавічскім раёнах. Уяўляе сабой леса-балотны масіў у Прыпяцкім Палессі паміж рэкамі Лань і Цна.

Пераважае плоскі рэльеф, асноўныя вышыні знаходзяцца ў межах 145-150 метраў, аднак тут ёсць асобныя пяшчаныя эолавыя груды.

Тэрыторыя ТВП з'яўляеца зонай падвышанага ўвільгатнення за кошт блізкага залягання грунтовых вод і мае выключна вялікае значэнне ў сілкаванні балот і рэк,

падтрымання пагодна-кліматычных характарыстак рэгіёна. Але амаль уся плошча значна дрэнуеца меліярацыйнымі каналамі, найбольшыя з іх Пляса, Крынічная, Стрыжэўскі, Заазёрскае. Стрыжэўскі канал і р. Цна напаўняюць вадасховішча Велута. Вадасховішча было створана ў 1976 г. для рыбагадоўлі, увільгатнення і арашэння. Плошча 7,6 км$^2$. На вадасховішчы адзначаны шэраг вадаплаўных і каляводных відаў птушак.

У асноўным пераважаюць сасновыя і бярозавыя лясы, сустракаюца дубравы і чорнаальшаннікі. Адметнай рысай тэрыторыі з’яўляюца тое, што лес расце астраўкамі сярод балот. Шмат дзе такія астраўкі леса цяжкадаступныя для чалавека. Балота вельмі разнастайныя. Есць балоты пераходнага тыпу з саснякамікустарнічкава-зеленамошнымі. На верхавых балотах растуць сфагнавыя хвойнікі. Пераважаюць нізінныя балоты.

У склад ТВП уваходзіць заказнік “Борскі”. Ён створаны ў 1979 г. Знаходзіца ў басейне р. Лань у межах Ганцавічскага і Лунінецкага раёнаў. Агульная плошча 2805 гектар. Створаны для захавання верхавых і пераходных балот і рацыянальнага выкарыстання клюквы.

Тэрыторыя выкарыстоўваеца ў асноўным для лясной гаспадаркі. Кожны год актыўна вядзецца нарыхтоўка журавін на верхавых балотах.

## Habitats:

балоты (у тым лікам пад лесам) – 34% (верхавыя – 8,8%, пераходныя – 3,5%, нізінныя – 21,7%), лясы (без уліка балотных) – 63,5%, вадасховішчы – 1,5%, іншыя землі – 1%.

## Birds:

ТВП Велута мае міжнароднае значэнне для захавання месц гнездавання глабальна пагражаемага віда вялікага арляца*Aquilaclanga.* Акрамя таго тут адзначаны на гнездаванні яшчэ некалькі рэдкіх драпежных птушак.

Дакладны склад арнітафаўны рэгіёна не вядомы, патрэбны дадатковыя даследванні.

## Other animal groups:

не вядома.

## Populations of IBA trigger species:

| Species | Season | Quality of estimate | Period | Quality of estimate | Trends | IBA criteria |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Black-throated diver *Gavia arctica* | P | + | 2009 | Poor | | |
| White-tailed eagle *Haliaeetus albicilla* | B | + | 2005-2010 | Poor | | |
| Short-toed eagle *Circaetus gallicus* | B | + | 2005-2010 | Poor | | |
| Lesser spotted eagle *Aquila pomarina* | B | + | 2005-2010 | | | |
| Spotted eagle *Aquila clanga* | B | 2-4 breeding pairs | 2005-2010 | Good | ↔ | A1 |

## Other biodiversity:

Расліны:журавіны дробнаплодныя *Oxycoccusmicrocarpus*, вярба чарнічная *S alix myrtilloides*.

## Threats:

- Парушаны гідралагічны рэжым тэрыторыі.
- На асушаных тэрыторыях узнікаюць амаль штогод пажары.

## Recommendations for the conservation:

- Патрэбна стварэнне ААПТ і плана кіравання ёй.
- Нармалізаваць гідралагічны рэжым тэрыторыі для прадухілення пажараў.

- Правесці дадатковыя даследванні біяразнастайнасці тэрыторыі.

## References:

Асабістыя паведамленні: Дамброўскі В.Ч., Левы С.В.

Блакітная кніга Беларусі: Энцыкл./Беларус. Энцыкл.; Рэдкал.: Б 28 Н.А. Дзісько і інш.– Мн.: БелЭн, 1994.– 415 с.: іл.

**Authors :** Левы С.В.

---

* *Использование размещенной здесь неопубликованной информации для научных публикаций без письменного соглашения ее авторов запрещено. В случае использования части контента или страницы целиком на других интернет-ресурсах, обязательна ссылка на авторов и сайт iba.ptushki.org*